# КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫЯ ЗАДАННІ ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА”

## Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі: будова, значэнне, ужыванне

1. *Прачытайце тэкст. Растлумачце, чаму ён так называецца. Вызначце стыль і тып маўлення.*

Лявоніха

Ах, Лявоніха, Лявоніха мая!
Спамяну цябе ласкавым словам я, –
Чорны пух тваіх загнутых брывянят,
Вочы яркія, вясёлы іх пагляд;
Спамяну тваю рухавую пастаць,
Спамяну, як ты умела цалаваць.
Ой, Лявоніха, Лявоніха мая!

Ты пяяла галасней ад салаўя,
Ты была заўсёды першай у танку –
І ў “Мяцеліцы”, і ў “Юрку”, і ў “Бычку”;
А калі ты жаці станеш свой загон,
Аж дзівуецца нядбайліца Лявон.

Ой, Лявоніха, Лявоніха мая!
У цябе палова вёскі – кумаўя.
Знала ты, як запрасіць, пачаставаць,
І дарэчы слова добрае сказаць,
І разважыць, і ў смутку звесяліць,
А часамі – і да сэрца прытуліць.

Ой, Лявоніха, Лявоніха мая!

Дай жа Бог табе даўжэйшага жыцця,
Дай на свеце сумным радасна пражыць,
Ўсіх вакол, як весяліла, весяліць.
Хай ніколі не забуду цябе я,
Ой, Лявоніха, Лявоніха мая!

М. Багдановіч

Якой ўяўляе аўтар Лявоніху? Якія рысы характару імпануюць аўтару? Ці можна сказаць, што Лявоніха сімвалізуе беларускую жанчыну? Абгрунтуйце сваю думку.

Падбярыце прыметнікі, якія маглі б ахарактарызаваць Лявоніху. Якія словаўтваральныя сродкі дазваляюць надаць экспрэсіўнасць назоўнікам *Лявоніха* і *брывянят*?

Патлумачце значэнне слова *танок*, падбярыце да яго сінонім. Назавіце вядомыя вам народныя беларускія танцы.

Вызначце ролю клічных сказаў у тэксце. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры звароткy. Ахарактарызуйце маўленчыя сітуацыі, у якіх могуць ужывацца наступныя звароткі, і складзіце з імі сказы: *Сябры! Калегі! Каляжанкі!* (афіцыйны зварот да калег); *Шаноўная грамада! Паважаныя! Шаноўныя!* (урачысты афіцыйны зварот да групы людзей); *Дарагая сябрына!* (урачысты зварот да кола сяброў); *Сябра! Дружа!* (неафіцыйны зварот да блізкага чалавека, звычайна ўжываецца пры перапісцы).

Якую функцыю ў тэксце выконваюць лексічныя паўторы?

Вызначце род назоўніка *нядбаліца*. Да якога тыпу скланення ён адносіцца?

Назавіце формы і канструкцыі, якія не адпавядаюць сучасным літаратурным нормам.

Назавіце звароты ветлівасці, якія выкарыстоўваюцца пры запрашэнні. Якія формы дзеясловаў у іх ужываюцца?

2. *Прачытайце тэкст, сфармулюйце яго тэму, асноўную думку.*

Каляды

Кажуць Каляды вянчаюць задумен..ы вечар год.. і даюць пачатак ночы гл..бокай. Кажуць стаяць яны на мяжы сонцаварот.., пад аховай старажытнага боства Каляды. Можа таму і завуцца Калядамі завейныя дні зімовага с..нцастаяння, што кола спрадвечнае жыццёвае здаецца ад іх коціцца ў неўміруч..сць.

Едзе Каляда ў ч..рвоным вазочк.. па заснежаным бальшаку. Тупае пад вокнамі. Дыхае ля агн.. шапоткага. Хто яна? Напэўна прыдумка прапрадзеда неразумнага? Ці магчыма мудрасць сусвет.. вечнага?

Не, Каляда не пачатак няспыннага шляху па крузе быцця. Каляда – я ў гэтым упэўнена – прадвесце зачыну, насенне, што тоіць у сабе выбух нараджэння. У гэту ноч на шалях часу, сапраўды, знаходзяцца спакой і зладжанасць аж да самага веснавога раўнадзенства. Потым, нарэшце, вясну загукаюць. І завязь паімкне да Вялікадня, да купальскай раскошы плоднасці. Затым да поўнага зямным набыткам Багача і ціхамернай гаворкі з продкамі на Дзяды ўвечары.

А пакуль што ў хатах сялянскіх Каляду сустракаць збіраюцца. Чакаюць, калі першая зорка запаліцца ў небе вечаровым. Задуменна глядзяць святыя з абразоў, беражліва агорнутых вышыванымі ручнікамі. Сапраўды, княжыць гармонія прыроды, чалавека і Космасу (Паводле Х. Лялько).

Хто такая Каляда і як яна, на вашу думку, выглядае? На якім месцы, паводле аўтара тэксту, стаіць Каляда сярод іншых святаў? Чаму пісьменніца называе яе «прадвеснем зачыну»? Якія народныя святы і прысвяткі ўзгадваюцца ў тэксце? Калі яны святкуюцца? Чаму аўтар аб’ядноўвае іх у гадавы колазварот? Абгрунтуйце сваю думку. Як святкуюцца Каляды сёння?

Запішыце першы і другі абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і неабходныя знакі прыпынку. Абгрунтуйце свій выбар.

Якія значэнні мае слова *каляда*? (*абрад хаджэння па хатах у калядныя вечары з віншаваннем, велічальнымі песнямі і пад.; песня, якая спяваецца ў*

*час гэтага абраду; падарункі, атрыманыя ад гаспадара за віншаванне, песні*).

У якім значэнні назоўнік *Каляда* ўжыты ў тэксце? (*Каляда – язычніцкі бог дастатку і ўраджаю*). Назавіце вядомыя вам імёны багоў, якіх шанавалі славяне ў дахрысціянскі перыяд (*Пярун – бог грому і маланкі, Сварог – бог неба, Дажбог – бог сонца, Ярыла – бог сонца, вясны і кахання, Вялес – бог жывёлагадоўлі* і інш.).

Выпішыце з тэксту сказы з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку.

Знайдзіце ў тэксце тры словы, напісанне і вымаўленне якіх не супадае.

Выпішыце з апошняга абзаца тэксту асабовыя назоўнікі. Раскажыце пра асаблівасці іх скланення.

## Сказы з адасобленымі членамі: будова, значэнне, ужыванне

3. *Прачытайце тэкст. Вызначце стыль і тып маўлення. Падбярыце загаловак да тэксту ў адпаведнасці з асноўнай думкай.*

Музыка не хлусіць. Музыка не можа хлусіць, бо яна – смутак душы аб недасяжным, якое адкрываецца толькі ў мінуты натхнення. І калі б адчуў чалавек усю сілу гэтага прыцягнення, калі б скарыўся ёй, – страціў бы сваю ўласную сілу, страціў і не аднавіў, застаўшыся ва ўладзе салодкіх і нярэдка згубных чараў. Музыка сфераў – не для слабай чалавечай душы.

Музыка сфераў… ***Кволы водсвет яе – малітва Баха, звернутая не да неба, да чалавека***. Але і гэтага водсвету даволі, каб апаліць душу, знішчыўшы ўсе повязі, усе павадкі, якія яе ўтрымліваюць.

Даўно адгучаў арган, даўно апусцеў сабор святога Роха, прыстасаваны пад канцэртную залу, і разышліся ўзрушаныя ці проста задаволеныя кароткаю сустрэчаю з мастацтвам слухачы. А Марыя, аглушаная, аглухлая, усё чула магутныя акорды прэлюдый. І, здавалася, не горад акружаў яе, а лес гукаў, у якім яна заблудзілася, не знаходзячы, ды і не шукаючы, сцежкі. Твар ціха свяціўся насустрач вечаровай вуліцы, і калі б хто-небудзь звярнуўся

зараз да яе, яна адчула б удар і здрыганулася, упусціўшы і разбіўшы штосьці крохкае. Штосьці, што вызначала і гэты вечар, і гэтыя хвіліны злітнасці з ім чуйнай, кранутай яго смуткам душы. Смуткам ніяк не ўсвядомленым, бо душа Марыі толькі-толькі прачыналася і для смутку, і для радасці (Паводле Т. Бондар).

Чаму музыка не можа хлусіць? Якая музыка ўзгадваецца ў тэкце? Як музыка можа ўздзейнічаць на чалавека? Дзе слухала класічную музыку Марыя? Як яна паводзіла сябе пасля канцэрта? Ці можна сцвярджаць, што класічная музыка – гэта музыка сфераў? Абгрунтуйце сваю думку.

Якіх беларускіх кампазітараў вы ведаеце? Якая тэматыка характэрна для іх творчасці?

Якую сэнсава-стылістычную ролю выконваюць у тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі, што перадаюць думкі і пачуцці Марыі.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры адасобленых членах сказа.

Вызначце, як утварыліся дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі з другога абзаца.

Вызначце разрады займеннікаў у другім абзацы, растлумачце іх тэкстаўтваральную ролю.

Зрабіце сінтаксічны разбор выдзеленага ў тэксце сказа.

4. *Прачытайце тэкст. Вызначце сродкі сувязі сказаў у тэксце. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.*

Буслы сёлета неданеслі вясну на крылах – згубілі недзе па дарозе. А Радзіма сустрэла птушак непагаддзю і мяцеліцай. Яны невядома куды пахаваліся, калі за снегавой завесай свету белага не было відаць.

Уздыхалі людзі гледз..чы на апусцелыя гнёзды прыкрытыя белымі сурв..ткамі снег... Тут яшчэ пазаўчора клекаталі ад радасці што вярнуліся (да)хаты сімвалы вясны і новага жыцця. Людзі баяліся што буслы сустрэўшы

ў р..дных мясцінах такі (не)гасцінны прыём зляцелі кудыс..ці на Палессе ці ў Польшчу. І не будзе больш (бела)чорных крылаў распрасцёртых у блакітнай высі дзес..ці зусім блі..ка ля сонца не будзе гарэзл..вага віску маладых бусл..нят.

Ад думкі, што ўсяго гэтага больш можа не быць, станавілася яшчэ ***халадней*** і **няўтульней** у гэтым няўтульным і халодным свеце.

Аднак, як толькі выглянула сонца, злізала апошні снег і падсушыла сталічныя тратуары, мамін вясёлы голас абвясціў у тэлефоннай трубцы: “Алёнка, буслы вярнуліся! Бачыла сёння на гняздзе. Худыя, жоўтыя нейкія, але адзін ужо клекатаў…”

Зваліўся з сэрца камень. Яны не маглі не вярнуцца. У іх жа ўсё як у людзей. Радзіма застаецца радзімай. Туды і толькі туды нясуць з усіх дарог стомленыя крылы (Паводле А. Ляўковіч).

Чаму буслы «неданеслі вясну на крылах»? Як сустрэла птушак радзіма? Чаго баяліся людзі? Што ўзрадавала Алёнку? Чаму ж буслы ўсё-такі не паляцелі з родных краёў? Знайдзіце ў тэксце сказы, якія пацвярджаюць гэту думку.

Што сімвалізуе бусел? Чаму У. Караткевіч назваў свой твор «Зямля пад белымі крыламі»? Якія яшчэ сімвалы Беларусі вы ведаеце?

Растлумачце напісанне арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку ў другім абзацы.

Утварыце назвы маладых істот ад назоўнікаў *варона, ластаўка, зязюля, дзяцел*.

Вызначыце пачатковую форму выдзеленых у тэксце слоў.

Як вы разумееце выразы *зваліўся з сэрца камень, свету белага не відаць, усё як у людзей*? Падбярыце беларускія фразеалагізмы, якія б з’яўляліся сінонімамі да названых.

Запішыце форму 2-асобы множнага ліку дзеясловаў *баяцца, заставацца*.

Пабудуйце схему першага сказа другога абзаца.

5. *Прачытайце тэкст. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з тэмай.*

Н..звычайнай нейкай новай з выгляду здавалася яму Беларусь.

Магутныя рэкі з мноствам прытокаў здаваліся сво..асаблівымі жывымі галінкамі, што атулілі аблюбаваную імі зямлю. Н..дрэнна прыдумана ўсё гэта пачатковымі сіламі свет..будовы. Проста і шчодра з пя..чотай зробл..на.

Майстры-д..каратары падумалі і пра тое, каб не было сумнай аднастайнасці. Чаму с..рабрыцца павінны толькі адны галінкі-рэчышчы? А хіба шматлікія ўпадзіны све..кі грукату вулканаў і скрыгату ледавікоў не варты таго, каб блі..чаць р..знафігурнымі пацеркамі?! ***І вось тысячы азёраў, быццам крыштальныя расінкі, абтрэс..ныя з галінак, пара..сыпаліся тут і там.*** Сціплыя задуменныя яны лагодна зіхцяць на сонцы.

Цікава прываблівa. Асабліва, калі бачыш усё разам і гэтыя галінкі з расінкамі і тое шырачэзнае ўлонне, якое іх трымае і гушкае (Паводле М. Ткачова).

Што незвычайнага ў выглядзе Беларусі? Як аўтар паказвае беларускія рэкі? Якімі яму ўяўляюцца беларускія азёры? Якія параўнанні і метафары выкарыстоўвае аўтар? Якую думку імкнецца перадаць аўтар тэксту?

У басейне якіх рэк размясцілася Беларусь? У Беларусі каля дзесяці тысяч азёр. Назавіце найбольш вядомыя з іх. Раскажыце легенду пра паходжанне пэўнага возера. З чым, на вашу думку, звязана распаўсюджанне на захадзе і паўночным захадзе нашай краіны азёр з назвай Белае?

Растлумачце напісанне арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах сказа, адасобленых азначэннях і прыдатках.

Абгрунтуце напісанне слоў праз злучок.

Выпішыце з тэксту часціцы, вызначце іх сэнсавую і тэкстаўтваральную ролю.

Выпішыце з тэксту аднасастаўны сказ, вызначце яго тып.

Вызначце граматычную аснову ў вылучаным сказе, назавіце спосабы выражэння дзейніка і выказніка. Зрабіце яго графічны сінтаксічны разбор.

Растлумачце, як утварыліся словы *скрыгат* і *ўлонне*.

6. *Прачытайце тэкст. Вызначце сродкі сувязі сказаў у тэксце. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.*

У Беларусі часта можна пачуць паданні пра затопленыя скарбы, асабліва французскія ці напалеонаўскія або шведскія. Часта гавораць, што ў рацэ затануў воз грошай ці зброі або залатая карэта. Можна пачуць паданні, што ў рацэ нехта згубіў шапку – швед, царыца Кацярына або Напалеон. У XIX ст. на Гродзеншчыне адзін памешчык нават спрабаваў у рацэ шукаць гарматы, нібыта напоўненыя золатам. Паводле падання, гэтыя гарматы скінулі ў раку шведы, калі іх засталі рускія войскі. Для падводных пошукаў гродзенскі памешчык вынайшаў спецыяльную машыну, але яму не пашанцавала знайсці скарб.

На Б..разіне каля Барысав.. пачынаючы з 1813 год.. шукаюць кр..млёўскія багац..і. Найбольш значныя працы вяліся ў 1896, 1909 і 1910 гг. Пошукі працяг..ваюцца і ў нашы дні.

Зімой на лёдзе многіх рэк адбываліся бітвы, часта нават і вялікія, якія ўвайшлі ў сусветную гісторыю. Несумненна, сляды гэтых падзей апынуліся на дне вадаёмаў (Э. Зайкоўскі, Л. Дучыц).

Якія скарбы шукаюць на дне беларускіх рэк і азёр? З якімі гістрычнымі падзеямі гэта звязана? Якія вы ведаеце бітвы, што адбываліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі? Раскажыце паданні і легенды пра скарбы, прыхаваныя на дне рэк і азёр. Як вы думаеце, ці трэба шукаць скарбы сёння? Абгрунтуйце сваю думку?

Спішыце сказы з перадапошняга абзаца, устаўляючы прапушчаныя літары і расстаўляючы знакі прыпынку. Запішыце лікі словамі. Вызначце, якімі членамі сказа з'яўляюцца лічэбнікі.

Знайдзіце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Вызначце спосаб пераносу (метафара, метанімія, сінекдаха).

Вызначце, як утварыліся словы *вадаём, багацце, падводны*.

Выпішыце з тэксту сказы з пабочнымі канструкцыямі, абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку. Пабудуйце схему аднаго сказа.

## Сказы з параўнальнымі зваротамі

7. *Прачытайце тэкст. Вызначце, да якога стылю ён адносіцца.*

Будзь заўсёды, як Радзіма, добры,
Будзь ласкавы, як яе трава,
Будзь высокі без памкненняў дробных,
Як над полем неба сінява,
Просты будзь, як калыханка маці,
Дбайны будзь, як сейбіт і ратай.
Нават, калі ўсё на свеце страціў –
Заклінаю: гэта не аддай.

В. Зуёнак

Да каго звяртаецца аўтар верша? Як вы разумееце выраз: «*Заклінаю: гэта не аддай*»? Да чаго заклікае аўтар? Якімі важнымі якасцямі павінен валодаць чалавек? Якія словы аўтара гавораць пра тое, што чалавек і прырода – адно цэлае? Абгрунтуйце сваю думку.

Шляхам падбору роднасных слоў растлумачце значэнне слова *ратай*. Ці ўжываецца гэта слова ў афіцыйным стылі?

Выпішыце дзеяслоў загаднага ладу, растлумачце, як ён утварыўся. Назавіце граматычную аснову ў першым сказе. Ці можна сцвярджаць, што гэты сказ аднасастаўны? Раскажыце пра яго стылеўтваральную функцыю.

Знайдзіце ў тэксце параўнальныя звароты. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры канструкцыях з ***як***.

Якія чалавечыя якасці вы хацелі б захаваць ці набыць? Працягніце думку аўтара, выкарыстоўваючы прыметнікі ў канструкцыі *будзь…, як….* Выкарыстайце гэту канструкцыю пры напісанні віншавання сябру ці сваім родным.

Ужываючы словы з тэксту, складзіце і запішыце сказы з параўнаннямі-выказнікамі: *Радзіма як …, трава што…, поле нібы …, матуля як …, калыханка што…, свет нібы…*

Пра чалавека часам гавораць *гол як сакол.* Карыстаючыся «Этымалагічным слоўнікам фразеалагізмаў» І.Я. Лепешава, растлумачце паходжанне гэтай фразеалагічнай адзінкі. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку перад ***як*** у складзе фразеалагізма, прывядзіце ўласныя прыклады.

8. *Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып. Падбярыце загаловак да тэксту ў адпаведнасці з асноўнай думкай.*

Вяртаючыся, аднак, да мовы, нялішне заўважыць, што адна з яе шматлікіх праблем заключаецца ў несумненным дысбалансе структурных страт і набыткаў. Народжаная на сельскіх прасторах, цудоўна прыстасаваная да прыроды, сялянскага побыту, яна нібы чужаніца сярод каменных гмахаў горада, у бензінавым чадзе ўрбанізаванага грамадства. Тут яна страчвае як непатрэбную значную частку сваёй мілагучнай, быццам песня, лексікі, гармонію моўнага ладу. А што набывае?..

Можа адна з гало..ных прычын ад якой залеж..ць будучыня нацы..нальнай культуры у значнай меры заснавана на роднай мове. Калі як след удумацца то з мовы пач..наецца ўсё астатн..е. Праз літаратуру сро..кі масавай інфармацыі культура набывае свой змест і ўжо (безумоўна)непаўторнае нацы..нальнае абліч..а.

Мова як прадукт душы і душа як прадукт роднай мовы? Мабыць, варта задумацца…(Паводле В. Быкава)

Ці заклікае В. Быкаў берагчы родную мову? Ці ёсць у тэксце сказы, якія дапамагаюць рэалізаваць задуму аўтара? Ці можна звязаць асноўную думку тэксту з асноўнай думкай аўтара папярэдняга верша?

У чым, на думку аўтара, заключаецца адна з праблем захавання і развіцця беларускай мовы? Чаму аўтар называе беларускую мову *чужаніцай*?

Адкажыце на пытанне аўтара ў першым абзацы.

Спішыце другі абзац тэксту, абгрунтоўваючы напісанне арфаграм і пастаноўку знакаў прыпынку.

Назавіце дзеепрыметнікі і дзеепрыслоўі. Раскажыце, як яны ўтварыліся. Вызначце, якую ролю выконваюць дзеепрыметнікавыя і дзеепрыслоўныя звароты ў сказах. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

Выпішыце з другога і трэцяга абзацаў сказы з пабочнымі словамі. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку. Дакажыце, што такія сказы ўжываюцца ў тэкстах тыпу разважання.

Назавіце сказы з параўнальнымі зваротамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры канструкцыях са злучнікамі *як, нібы.* Пабудуйце схемы сказаў.

Зрабіце сінтаксічны разбор апошняга сказа.